1. Якія асноўныя задачы павінны былі вырашыць Парыжская і Вашынгтонская канферэнцыі?
2. Ахарактарызуйце супярэчнасці паміж дзяржавамі-пераможцамі ў пытанні пра пасляваеннае ўладкаванне свету.
3. Растлумачце, чаму Версальскі мірны дагавор Германія ўспрыняла як нацыянальнае прыніжэнне.
4. Як змяніліся межы еўрапейскіх дзяржаў пасля заключэння мірных дагавораў з пераможанымі краінамі? Для адказу выкарыстайце картасхему «Еўропа ў 1917—1923 гг.» на с. 12.
5. З якой мэтай уводзілася мандатная сістэма? Дакажыце, што яна стала спосабам перадзелу каланіяльных уладанняў паміж краінамі-пераможцамі.

Ці можна сказаць, што Версальскі мір, не вырашыўшы даваенных супярэчнасцяў, прывёў да з’яўлення новых — паміж пераможцамі і пераможанымі?

**З Версальскага мірнага дагавора. 28 чэрвеня 1919 г.**

З мэтай зрабіць магчымай падрыхтоўку агульнага абмежавання ўзбраенняў усіх нацый Германія абавязваецца строга выконваць вызначаныя ніжэй палажэнні. <…>

**Артыкул 160.** …З гэтага моманту агульны колькасны склад арміі дзяржаў, якія ўтвараюць Германію, не павінен перавышаць 100 тысяч чалавек, у тым ліку афіцэраў і нестраявых, і будзе выключна прызначаны для падтрымання на тэрыторыі парадку і для пагранічнай паліцыі. <…>

**Артыкул 173.** Усялякага кшталту ўсеагульная абавязковая ваенная служба будзе адменена ў Германіі. Германская армія можа будавацца і камплектавацца толькі шляхам добраахвотнага найму.

*Якія абавязацельствы давала Германія ў дачыненні скарачэння ўзбраенняў? Якія функцыі павінна была выконваць германская армія?*

# § 3. Заходняя Еўропа і ЗША ў 1918—1929 гг.

*1. Ахарактарызуйце рашэнні, прынятыя на Парыжскай мірнай канферэнцыі ў дачыненні Германіі. 2. У якой форме ўсталявалася ўлада рабочых і сялян у Расіі? 3. Якім было эканамічнае становішча асноўных краін Захаду пасля Першай сусветнай вайны?*

Першае пасляваеннае дзесяцігоддзе ў гісторыі Заходняй Еўропы можна падзяліць на два перыяды: пяць гадоў эканамічнага і палітычнага крызісу (1919—1923) і наступныя шэсць гадоў адноснага міру і дабрабыту (1924—1929).

**Рэвалюцыя ў Германіі.** Першая сусветная вайна стала асноўнай прычынай рэвалюцыйнага ўздыму ў краінах Захаду. Яна да мяжы абвастрыла сацыяльныя супярэчнасці ў краінах, што ваявалі, асабліва ў тых, што пацярпелі паражэнне.

Правообладатель Издательский центр БГУ



Удзень 9 лістапада 1918 г. перад шматлюднай народнай дэманстрацыяй дзяржаўны сакратар Ф. Шэйдэман абвясціў Германію дэмакратычнай рэспублікай

У найбольш складаным становішчы апынулася Германія. Велізарныя ваенныя выдаткі і вельмі цяжкія для краіны ўмовы Версальскага дагавора прывялі яе эканоміку да катастрофы. У Германіі пачаўся голад, збядненне насельніцтва дасягнула крытычнай мяжы. Салдаты і матросы сталіліся ад вайны і не хацелі ваяваць. Сацыялісты патрабавалі спыніць вайну, скасаваць манархію і правесці рэформы. Нагодай для рэвалюцыі стала паўстанне ваенных маракоў у Кілі, якія адмовіліся падпарадкоўвацца камандаванню. ***4 лістапада 1918 г.*** яны разам з працоўнымі захапілі ўладу ў горадзе. Масавыя выступленні ахапілі ўсю Германію.

*9 лістапада 1918 г.* выбухнула паўстанне ў Берліне. У гэтых умовах кайзер Вільгельм II паспешліва адмовіўся ад трона і ўцёк у Галандыю. У гэты ж дзень Германія была абвешчана рэспублікай. Новы ўрад узначаліў лідар памяркоўнага крыла Сацыял-дэмакратычнай партыі Германіі (СДПГ) ***Фрыдрых Эберт***. Праз два дні, ***11 лістапада 1918 г.***, ён падпісаў перамір'е з краінамі Антанты. Так завяршылася Першая сусветная вайна. Урад абяцаў увесці 8-гадзінны працоўны дзень, правесці выбары ў Нацыянальны сход і заявіў, што будзе імкнуцца да «ажыццяўлення сацыялізму».

У снежні 1918 г. рэвалюцыйна настроеныя левыя сацыял-дэмакраты ўтварылі *Камуністычную партыю Германіі (КПГ)*. Яе прыхільнікі выступалі за гвалтоўныя метады барацьбы і ўсталяванне дыктатуры пралетарыяту. Рознагалоссі паміж левымі і правымі дасягнулі найбольшай вастрыні ў перыяд берлінскага ўзброенага паўстання ў студзені 1919 г. Урад Эберта задушыў паўстанне, жорстка расправіўшыся з камуністамі. Іх лідары *Карл Лібкнехт* і *Роза Люксембург* былі забіты.

Рэвалюцыйныя выступленні працягваліся і ў іншых абласцях Германіі. Самае буйное адбылося ў Баварыі. Тут 13 красавіка 1919 г. у Мюнхене была абвешчана *Баварская Савецкая рэспубліка*. Урад на чале з камуністамі нацыяналізаваў банкі, усталяваў рабочы кантроль на прадпрыемствах, стварыў Чырвоную гвардыю, заявіў пра салідарнасць з Савецкай Расіяй. У пачатку мая ўрадавыя войскі разграмілі савецкі рух у Баварыі. З ліквідацыяй Баварскай Савецкай рэспублікі ***3 мая 1919 г.*** Лістападаўская рэвалюцыя ў Германіі завяршылася.

У лютым 1919 г. у невялікім гарадку Веймары пачаў сваю працу Нацыянальны сход. *31 ліпеня 1919 г.* ён прыняў новую Канстытуцыю Германіі, якая замацавала буржуазна-дэмакратычныя заваёвы Лістападаўскай рэвалюцыі. Па месцы прыняцця Канстытуцыі дзяржаўны лад Германіі атрымаў назву *Веймарскай рэспублікі*.

№ 2

Правообладатель Издательский центр БГУ




Рэвалюцыйныя падзеі ў Еўропе (1917—1920)

*Дзе былі абвешчаны савецкія рэспублікі? Пра што сведчыць спроба ўсталявання савецкіх рэспублік у Еўропе? Чаму гэтыя рэспублікі не выстаялі?*

**Рэвалюцыйны ўздым у іншых краінах Еўропы.** Акрамя Германіі рэвалюцыйная хваля ахапіла многія краіны Еўропы. У канцы вайны пачаўся распад Аўстра-Венгерскай імперыі. Рэвалюцыі выбухнулі ў Венгрыі, Аўстрыі, Чэхіі, Славакіі.

У Аўстрыі была ўсталявана дэмакратычная рэспубліка. У Венгрыі вясной 1919 г. да ўлады прыйшлі камуністы. Яны абвясцілі *Венгерскую Савецкую рэспубліку*. На ўзор Савецкай Расіі ў краіне былі ажыццёўлены сацыялістычныя пераўтварэнні, створана Чырвоная Армія. Праіснаваўшы 133 дні, рэспубліка пала пад ударамі краін-інтэрвентаў.

У краінах-пераможцах рэвалюцыйны рух не набыў такога шырокага размаху. Масавыя забастоўкі звычай мелі эканамічны характар. У шэрагу выпадкаў рабочыя выступалі супраць умяшання замежных дзяржаў ва ўнутраныя справы Савецкай Расіі.

Характэрнай рысай пасляваеннага рэвалюцыйнага ўздыму стаў камуністычны рух. Камуністычныя партыі ўзніклі ў многіх краінах. У адрозненне ад сацыял-дэмакратаў камуністы выступалі за рэвалюцыйную змену грамадства шляхам узброенай барацьбы. Па ініцыятыве расійскіх камуністаў і іх лідара У. І. Леніна ў *сакавіку 1919 г.* адбылося аб'яднанне гэтых партый у міжнародную арганізацыю *Камуністычны Інтэрнацыянал (Камінтэрн)*. Кіраўніцтва Савецкай Расіі імкнулася выкарыстоўваць камуністычны рух у сваіх інтарэсах.

**Узнікненне фашызму.** Асноўнымі перадумовамі фашысцкага руху ў Еўропе былі збядненне народных мас у выніку Першай сусветнай вайны, пашырэнне ідэй вырашальнай ролі насілля, тэрору і войнаў у гісторыі, культу моцнай асобы (правадыра). Фашысты патрабавалі ліквідаваць буржуазна-дэмакратычны лад, задушыць рэвалюцыйны рух, усталяваць аднапартыйную дыктатуру. Для прыцягнення мас на свой бок яны выкарыстоўвалі сацыялістычныя лозунгі і сцвярджалі, што імкнуцца пабу-

Правообладатель Издательский центр БГУ

даваць нацыянальны сацыялізм. Амаль усе фашысцкія рухі характарызаваліся крайнім расізмам, а таксама нецярпімасцю і варожым стаўленнем да яўрэяў — *антысемітызмам*.

Адна з першых фашысцкіх арганізацый у Еўропе ўзнікла ў Германіі ў студзені 1919 г. Праз год яна стала называцца Нацыянал-сацыялістычнай нямецкай рабочай партыяй (НСДАП — ад першых літар назвы партыі па-нямецку). Членаў партыі і прыхільнікаў яе ідэалогіі называлі нацыянал-сацыялістамі або нацыстамі. У сваёй праграме нацысцкая партыя патрабавала адмены Версальскага дагавора, стварэння «Вялікай Германіі», правядзення частковай канфіскацыі юнкерскага землеўладання, абмежавання буйнога капіталу і сацыяльнай абароны працоўных. Ідэолагі партыі сцвярджалі, што немцы з'яўляюцца найвышэйшай расай, заклікана́й панаваць у Еўропе і свеце. Лідарам НСДАП стаў ветэран Першай сусветнай вайны *Адольф Гітлер*.

**Прыход фашыстаў да ўлады ў Італіі.** У 1919 г. пад кіраўніцтвам сацыялістаў і камуністаў італьянскія рабочыя пачалі захопліваць заводы і фабрыкі, а сяляне — незанятыя землі, патрабуючы падзелу латыфундый. Напалоханыя ўласнікі ўзбройваліся, стваралі атрады самаабароны. Краіна нястрымна каціліся да грамадзянскай вайны.

У гэтых умовах сталі ўзнікаць фашысцкія арганізацыі. Адну з іх, «Саюз барацьбы» (Фашыа ды камбатымента), узначаліў былы сацыяліст *Беніта Мусаліні*. Ён умела выкарыстаў расчараванне і незадаволенасць італьянскага грамадства вынікамі вайны. Мусаліні жорстка крытыкаваў урад і дэмакратыю ў цэлым за няздольнасць адстойваць інтарэсы нацыі, актыўна прапагандаваў ідэю «Вялікай Італіі» — спадчынніцы Старажытнага Рыма, патрабаваў аднаўлення парадку ў краіне. Фашысты адкрыта прэтэндавалі на ўладу. З гэтай мэтай у лістападзе 1921 г. на аснове «Саюза барацьбы» і яго аддзяленняў была створана Нацыянальная фашысцкая партыя.

Фашысцкія ідэі атрымалі шырокае распаўсюджанне і былі ўспрыняты кіроўнымі коламі. У *кастрычніку 1922 г.* кароль Віктар Эмануіл III прапанаваў кіраўніку Нацыянальнай фашысцкай партыі ўзначаліць урад. Мусаліні прыняў прапанову, і ў Італіі пачала фарміравацца фашысцкая дыктатура.



У кастрычніку 1922 г. фашысты на чале з Б. Мусаліні здзейснілі «паход на Рым». Улада ў Італіі перайшла да фашыстаў да 1943 г.

Правообладатель Издательский центр БГУ



Падчас гіперінфляцыі ў Германіі ў 1921—1923 гг. дзеці гулялі з банкнотамі замест цацак

**Асаблівасці сацыяльна-эканамічнага і палітычнага развіцця краін Захаду.** У 1924—1929 гг. у краінах Захаду настаў перыяд адноснага міру і дабрабыту. Паступова пераадольваўся эканамічны крызіс, хоць становішча нельга было назваць устойлівым. Вырашальную ролю ў эканоміцы сталі адыгрываць новыя тэхналогіі.

Найбольш спрыяльная сітуацыя склалася ў ЗША. Пасля кароткага пасляваеннага крызісу насталі 10 гадоў беспрэцэдэнтнага эканамічнага росквіту. Пачалася эпоха масавага спажывання, што садзейнічала росту ўзроўню жыцця насельніцтва.

Больш павольнымі тэмпамі пераадольвалася пасляваенная разруха ў Вялікабрытаніі. У краіне захоўваліся высокі ўзровень беспрацоўя і сацыяльная напружанасць. У *1926 г.* адбылася найбуйнейшая ў гісторыі краіны ўсеагульная забастоўка рабочых. Гэта падзея істотна паўплывала на вынікі парламенцкіх выбараў 1929 г. Лейбарысты ўпершыню атрымалі большасць месцаў у Палаце абшчын і сфарміравалі ўрад.

Няпростым быў пераход да мірнага жыцця ў Францыі. Многія французы адчувалі сябе не пераможцамі, а пераможанымі ў вайне. Краіна была спустошанай, асабліва яе паўночная частка. Эканамічны рост адбываўся павольна і ў асноўным за кошт германскіх рэпарацый. Інфляцыя спынілася толькі ў 1928 г., што азначала вяртанне да дабрабыту.

Эканамічны і палітычны хаос пасля вайны перажывала Германія. Яна аказалася не ў стане выплачваць рэпарацыі. Таму ў 1924 г. дзяржавы-пераможцы вырашылі скараціць іх удвая. Для выплаты рэпарацый Германія атрымлівала буйну́ю амерыканскую пазыку. Праўда, за яе давялося расплачвацца акцыямі прадпрыемстваў. Тым не менш гэта адкрывала шлях да аднаўлення нямецкай эканомікі. Але ключавыя яе галіны і банкі апынуліся пад кантролем амерыканскага капіталу.

**Міжнародныя адносіны.** Супярэчлівы характар Версальска-Вашынгтонскай сістэмы вы́клікаў асаблівую актыўнасць міжнароднай дыпламатыі. Савецкая Расія і Германія імкнуліся выйсці з міжнароднай ізаляцыі. *16 красавіка 1922 г.* яны падпісалі ў *Рапала* (каля Генуі) дагавор. Абодва бакі ўсталёўвалі дыпламатычныя стасункі і адмаўляліся ад узаемных фінансавых прэтэнзій, уводзілі прынцып найбольшага спрыяння ў эканамічных адносінах.

Францыя імкнулася атрымаць міжнародныя гарантыі недатыкальнасці сваіх межаў з Германіяй. Гэтая праблема была вырашана ў *1925 г.* на міжнароднай канферэнцыі ў *Лакарна* (Швейцарыя). У адпаведнасці з *Лакарнскімі дагаворамі* яе ўдзельнікі гарантавалі недатыкальнасць германа-бельгійскай і германа-француз-

Правообладатель Издательский центр БГУ

Прадстаўнікі савецкай і нямецкай дэлегацый у Рапала. 1922 г.



скай межаў у тым выглядзе, у якім яны былі вызначаны Версальскім дагаворам. Пры гэтым заставалася «адкрытым» пытанне аб усходніх межах Германіі. Польшчы заходнія дзяржавы падобных гарантый не давалі. Такая палітыка Францыі і Вялікабрытаніі дазваляла Германіі ў далейшым узняць пытанне пра ўз'яднанне нямецкай нацыі ў межах адной дзяржавы.

1. Ахарактарызуйце асноўныя этапы Лістападаўскай рэвалюцыі ў Германіі.
2. Якія асноўныя палітычныя сілы ўдзельнічалі ў Лістападаўскай рэвалюцыі? У чым заключаліся адрозненні ў іх поглядах на задачы рэвалюцыі?
3. Параўнайце рэвалюцыйныя выступленні ў Германіі і Аўстра-Венгрыі. Чаму рэвалюцыі ў Германіі і Аўстра-Венгрыі можна разглядаць як буржуазна-дэмакратычныя?
4. Назавіце перадумовы прыходу да ўлады фашыстаў.
5. Якія працэсы характэрныя для сацыяльна-эканамічнага развіцця краін Захаду ў 1924—1929 гг.?
6. Назавіце заходнееўрапейскую дзяржаву, якая першай прызнала Савецкую Расію. Чаму гэтыя дзяржавы былі зацікаўлены ў збліжэнні?

У свой час Генры Форд быў прызнаны лепшым бізнесменам XX ст. Высветліце, якія новыя элементы былі пакладзены ў аснову арганізацыі вытворчасці на заводах Г. Форда. Як на развіццё вытворчасці і сучаснага грамадства паўплывалі новаўвядзенні, укаранёныя Г. Фордам?

**Фрыдрых Эберт** (1871—1925) — палітычны і дзяржаўны дзеяч, адзін з лідараў германскай сацыял-дэмакратыі. Нарадзіўся ў Гейдэльбергу ў сям'і краўца. З маладых гадоў удзельнічаў у прафсаюзным руху і вёў актыўную палітычную дзейнасць у Брэмене. Напярэдадні Лістападаўскай рэвалюцыі выказваў спадзяванні на захаванне манархіі. Настаяў на правядзенні ўсеагульных выбараў у Нацыянальны сход. Стаў першым у гісторыі Германіі дэмакратычна абраным кіраўніком дзяржавы. Згодна з завяшчаннем Эберта быў заснаваны фонд яго імя, які дзейнічае да гэтага часу.



Правообладатель Издательский центр БГУ